ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983

10 ЛІСТАПАДА

ЧАЦВЕР

№ 30 (1406)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### ПРАЙШЛА

V справаздачна-выбарная канферэнцыя камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў і выкладчыкаў універсітэта. У той жа дзень адбылося арганізацыйнае пасяджэнне новага саставу камітэта камсамола. Сакратаром выбраны асістэнт механіка-матэматычнага факультэта Ю. Пазняк.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

### ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ

спартакіяды ВНУ рэспублікі. Месцы размеркаваліся наступным чынам: першае — БПІ, другое—Гомельскі універсітэт, БДУ імя У. І. Леніна — на трэцім.

**А. БАЛДЗІН,**
**старшыня спартыўнага клуба.**

### КАЛЕКТЫВЫ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

універсітэта выступілі перад працаўнікамі Маскоўскага раёна сталіцы са святочным канцэртам, прысвечаным 66-й гадавіне Вялікага Кастрычніка.

**Э. АНІСЕНКА,**
**мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.**

### КАМІТЭТ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

на чарговым пасяджэнні разгледзеў рэзультаты рэйдавых праверак КНК і «Камсамольскага пражэктара» аб эканамічным расходаванні электраэнергіі. Было адзначана нерацыянальнае выкарыстанне электраэнергіі на фізічным факультэце.

КНК сумесна з групамі народнага контролю праведзены рэйды па праверцы наведвання лекцый студэнтамі. У рэзультаце праверак было выяўлена, што на фізічным, філалагічным, механіка-матэматычным факультэтах, факультэце прыкладной матэматыкі на асобных лекцыях адсутнічала да 30 працэнтаў студэнтаў. У пастанове КНК дэканатам рэкамендавана прыняць неабходныя меры дысцыплінарнага і грамадскага ўздзеяння.

Член камітэта народнага кантролю А. А. Яноўскі інфармаваў Камітэт аб пачатку заняткаў у школах народных кантралёраў.

**А. КАСПЯРОВІЧ,**
**старшыня КНК.**

## «У ДОБРЫ ШЛЯХ ЗА ТРЫВАЛЫМІ ВЕДАМІ!»



СВЯТА гэта рыхтавалася старанна. І нават цяжка сказаць, хто прымаў у яго падрыхтоўцы большы ўдзел — супрацоўнікі бібліятэкі ці калектыў геаграфічнага факультэта. Але лічыцца славаю ніхто не збіраўся, і таму, калі адгучалі апладысменты і дырэктар бібліятэкі Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская, разрэзаўшы традыцыйную стужку, запрасіла прысутных у толькі што створаную чытальную залу геаграфічных навук, стала зразумела, што ўсе добрыя словы, якія ўжо сказалі і якія яшчэ будуць сказаны — не проста даніна традыцыі. Яны — ад шчырага сэрца, яны — падзяка за такі патрэбны для студэнтаў і супрацоўнікаў геафака падарунак.

І сапраўды, як гэта зручна, у час, калі мы прывычна скардзімся, што іменна яго, часу, нам і не хапае, мець, як кажуць, пад рукой такую скарбонку мудрых думак, такое сховішча будучых курсавых, дыпломных і іншых работ...

Гэта жартам. А ўсур'ёз супрацоўнікі бібліятэкі спадзяюцца ў будучым папаўняць фонды чытальнай залы спецыяльнай літаратурай, савецкімі і замежнымі перыядычнымі выданнямі, арганізоўваць выстаўкі, прысвечаныя юбілеям факультэцкіх кафедр. Дарэчы, чытальная зала ўжо адзначыла такім чынам 50-годдзе кафедры глебазнаўства і геалогіі.

Мяркую, не трэба доўга даказваць, што адкрыццё чытальнай залы геаграфічных навук — справа добрая і патрэбная. Яе перавагі ацэняць чытачы, а мне застаецца толькі пагадзіцца са словамі ўсіх, хто выступаў на ўрачыстасці — у добры шлях за трывалымі ведамі!

**Н. АЛЕГАВА,**
**наш кар.**

**На здымку:** урачыстая хвіліна адкрыцця чытальнай залы; намеснік дэкана геафака І. І. Пірожнік — адзін з першых наведвальнікаў.

**Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.**



ПАТРАБУЕ ВЫРАШЭННЯ!

## «ВЕЧНЫЯ» СТУДЭНТЫ... ПАНЯВОЛІ

ЯК ВЯДОМА, ва універсітэтах не прынята пакідаць студэнтаў на другі год. Таму пераважная колькасць выпускнікоў вымушана ўкладвацца ў пяцігадовы тэрмін. Цікавы спосаб павялічыць працягласць універсітэцкай «прапіскі» вынайшлі члены акадэмічнага сектара камітэта камсамола.

Вам, чытачы, пэўна ж даводзілася бываць на трэцім паверсе галоўнага корпуса? Бачылі вы і стэнд «Лепшыя студэнты універсітэта», які размешчаны ля ўваходу ў бібліятэку. А ці вядома вам, паважаныя, што большасць прадстаўленых там людзей і не студэнты зусім? Дакладней кажучы, даўно ўжо не студэнты. Колькі ж можна адносіць да ліку студэнтаў такіх паважаных людзей, як, напрыклад, каментатар Беларускага радыё Сяргей Новікаў, ці кандыдат фізіка-матэматычных навук супрацоўнік Інстытута матэматыкі АН БССР Андрэй Рапінчук? Іх фотаздымкі маглі б упрыгожыць стэнд «Лепшыя выпускнікі універсітэта». Ды і сённяшніх выдатнікаў вучобы і грамадскіх актывістаў, відаць, мала задавальняе перспектыва атрымаць заслужаную пашану пасля таго, як яны пакінуць сцены роднага універсітэта. Пакуль жа ім даводзіцца спадзявацца толькі на тое, што намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна Святлана Канаш зменіць сваю пазіцыю адносна «вечных» студэнтаў.

**ЛІХТАРЫК.**

## МАЛАДЫМ — БУДАВАЦЬ!

Для сябе зямлю перабудуем
І дадзім мы назвы гарадам.
Бачыш, мы з табой чагось каштуем,
Калі горы кланяюцца нам.

Дзе мы пройдзем —
Скараюцца хвалі бурнай ракі.
Усё на свеце збываецца
З нашай лёгкай рукі!

**Аб тым, як папрацавалі СБА універсітэта гэтым летам, раскажуць 2—4 старонкі нумара.**

# МАЛАДЫМ —

## Традыцыі «Кастрычніка»

БАМ, КАЗАХСТАН, Пскоў, Карэлія — вось слаўныя вехі працоўнага шляху старэйшага СБА гістарычнага факультэта «Кастрычнік», які існуе з 1971 года. Дзе б ні былі байцы атрада, з якімі б цяжкасцямі ім не даводзілася сустракацца, яны заўсёды сваёй самаадданай працай пацвярджвалі, што нездарма назва іх атрада «Кастрычнік», дакладней не проста назва, — сімвал, сцяг, які аб'ядноўвае сяброў, паплечнікаў. 1983 год не стаў выключэннем. Байцы «Кастрычніка» ў які ўжо раз пацвердзілі сваё права лічыцца лепшым атрадам гістарычнага факультэта.

Байцы атрада працавалі на будаўніцтве аб'ектаў прамысловага прызначэння і жылля ў пасёлку Лангепас Ніжневартаўскага раёна Цюменскай вобласці. Трэба адзначыць, што атрад упершыню працаваў ва ўмовах Заходняй Сібіры з яе балотамі, гнусам, рэзкімі перападамі тэмпературы. Але нягледзячы на гэтыя і іншыя цяжкасці, атрад праявіў сябе з самага лепшага боку, асвоіўшы 270 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Не толькі ўдарнай працай на дагаворных аб'ектах адзначыў сябе атрад. Многае было зроблена ў плане шэфскай дапамогі: праца на будаўніцтве школы, добраўпарадкаванне пасёлка, лекцыі для насельніцтва. А чаго вартыя выступленні агітбрыгады пад кіраўніцтвам ветэрана «Кастрычніка» Мішы Сабурава! Яны заўсёды праходзілі пры вялікай аўдыторыі і карысталіся цёплай падтрымкай гледачоў.

Увогуле, трэці працоўны прайшоў на выдатна. І сёння мы, студэнты старэйшых курсаў гістарычнага факультэта, ветэраны «Кастрычніка», цвёрда верым, што слаўныя традыцыі нашага СБА падтрымае маладое пакаленне студэнтаў-гісторыкаў, якія яшчэ раз дакажуць ганаровае права называць свой атрад дарагім усім нам словам — «Кастрычнік».

**С. МАТОРАЎ,**
**камісар атрада.**

## !

## УДЗЯЧНЫ ЗА ДАПАМОГУ

**КАЛЕКТЫЎ Дома дзіцяці ўдзячны за дапамогу ў нялёгкай справе выхавання дзяцей-сірот членам універсітэцкага студэнцкага педагагічнага атрада імя Макаранкі.**

## «Якуцiя» у Якуціі

НАМ, БАЙЦАМ СБА «ЯКУЦІЯ», пашчасціла працаваць у гэтым годзе на паўночным усходзе нашай краіны. Наш атрад у саставе 28 чалавек быў сфарміраваны са студэнтаў 3—5 курсаў фізічнага факультэта. Мы працавалі на будаўніцтве Дэпутацкага горна-ўзбагачальнага камбіната. Тут, сярод тундры, на вечнай мерзлаце, пачалося буданўіцтва пасёлка гарнякоў, які да нашага прыезду налічваў тры інтэрнаты, сталовую, лазню, лесапільню, сталярны цэх і 5 палатак... Крыху пазней у пасёлку з'явіўся першы магазін.

Перад нашым атрадам стаяла задача забяспечыць пасёлак цяплом. Трэба было пабудаваць кацельную, уцяпліць цеплатрасу агульнай працягласцю 1,5 км, а таксама выканаць вялікі аб'ём работ на будаўніцтве рамонтна-механічных майстэрняў. Трэба сказаць, што байцы атрада папрацавалі сумленна. Звыш плана былі пабудаваны помпавая станцыя, цяпліца. Працаваць даводзілася ў складаных прыродных і кліматычных умовах, не ўсё было добра і з пастаўкай матэрыялаў, але самым цяжкім для байцоў было... нашэсце камароў. Такую колькасць насякомых нават цяжка сабе ўявіць. Аднойчы нашы дзяўчаты-паварыхі паставілі своеасаблівы рэкорд — за палову дня яны назбіралі поўнае вядро камароў!

Але, нягледзячы на гэтыя і іншыя цяжкасці, у працоўнай залікоўцы атрада многа добрых спраў. За 50 дзён выканана будаўніча-мантажных работ на суму 202 тысячы рублёў, сэканомлена будаўнічых матэрыялаў на суму больш за тысячу рублёў, унесена 1 рацпрапанова, аднаму з пабудаваных аб'ектаў прысвоены «Студэнцкі знак якасці». Запомняцца рабятам і экскурсіі на кар'ер, і цікава арганізаваны адпачынак, але самае галоўнае — тое, што і мы, студэнты БДУ імя У. І. Леніна, унеслі сваю лепту ў асваенне Поўначы, атрымалі добры жыццёвы ўрок.

**В. КАРСЕКА,**
**баец атрада.**

● ФОТАРЭПАРТАЖ З ЛЕТА ●

## *Мы памятаем цябе, Усць-Ілімск!*





ГЭТЫМ ЛЕТАМ інтэрнацыянальнаму будатраду «Волаты» пашчасціла працаваць у легендарным Усць-Ілімску. У тым самым, праз будоўлі якога ўжо прайшлі сотні студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

«Волаты» працавалі на ўзвядзенні адміністрацыйна-гаспадарчага будынка аб'яднанай аўтагаспадаркі. Але акрамя асноўнай даводзілася выконваць і іншыя работы: разам з рабочымі будаўніча-мантажнага ўпраўлення, якое нас прымала, нарыхтоўвалі корм для грамадскага статку раёна, удзельнічалі ў рамонце цяпліц.

На ніжнім здымку — урачысты сход, прысвечаны Дню будаўніка. У нас ён праходзіў непасрэдна на аб'екце, хутка і падзелавому.

**(Працяг на 3-й стар.).**



## «Нас называлі мамамі»

У ГЭТЫМ ГОДЗЕ камуністычны атрад механіка-матэматычнага факультэта «Маладосць» быў ужо не навічком і не адзіным сярод педагагічных атрадаў, што працавалі ў дзіцячых дамах рэспублікі. Патрабаванні да такіх атрадаў і да іх байцоў асаблівыя. Бо выхаванне — справа тонкая, тым больш, калі твае падапечныя— дзеці, пакінутыя бацькамі...

Дзяўчаты працавалі ў мінскім дзіцячым доме № 2, часам па дзве змены. Стараліся. Загадчыца не раз прапаноўвала нашым байцам заставацца на ўсё лета, на восень, прыходзіць на наступны год. Мы імкнуліся, каб дзецям было не сумна з намі.

Работа ў дзіцячым доме няпростая. Малышы вельмі чулыя да фальшы, нават самай замаскіраванай. Як ні спрабавалі мы, не атрымалася, усё ж неяк даведаліся дзеці, што не прыйдуць заўтра да іх «мамы» (працавалі мы апошні дзень). Даведаліся і паднялі роў. Плакалі да той пары, пакуль мы ўрачыста не паабяцалі: «Прыйдзем! Абавязкова прыйдзем да вас яшчэ!» Прыходзілі. І на прагулках будатрадаўскую форму насіла ўся малодшая група, не важна, што кішэні былі ніжэй калена, а рукавы цягнуліся па зямлі. Не важна, таму што мы верым: прыйдзе час і будатрадаўская форма будзе нашым сённяшнім выхаванцам у самы раз.

**Г. ЭСМАНТОВІЧ,**
**камандзір атрада.**

## *У краі тысяч азёр*

ЦУДОЎНЫ ГЭТА час — трэці працоўны семестр у краі тысяч азёр, у Карэліі. У сёмы раз быў узняты сцяг СБА «Верасы» хімічнага факультэта над верхавінамі карэльскіх сосен. У сёмы раз лепшыя студэнты факультэта змянілі дамашнюю ўтульнасць на цяжкасці гэтай суровай зямлі.

Байцамі атрада сталі тыя, хто добра зарэкамендаваў сябе ў падрыхтоўчы перыяд. Кожны ў «Верасах» меў некаторы вопыт у сталярных, слясарных, бетонных, малярных і іншых работах.

Месца дыслакацыі атрада — пасёлак Кесценьга, дзе рабяты будавалі жылыя дамы для рабочых Чупінскага леспрамгаса.

Будатрад — гэта не толькі вытворчая работа, але і цікавая і патрэбная грамадска-палітычная дзейнасць. У дружным калектыве без агульных спраў жыць немагчыма. Штодзённа праходзілі ўнутрыатрадныя мерапрыемствы: віктарыны, канцэрты, дыспуты. Асаблівую ўвагу ўдзялялі байцы «Верасоў» дзецям — пабудавалі спецыяльную дзіцячую пляцоўку. Дапамагалі леспрамгасу і ў нарыхтоўцы сена.

**А. БЯЛЯК,**
**начальнік штаба**
**працоўных спраў хімфака.**

# БУДАВАЦЬ!

## І ЛІЧБЫ ПЕСНЯЙ ГУЧАЦЬ

У ПРАЦОЎНЫМ СЕМЕСТРЫ 1983 года актыўны ўдзел прыняў зводны атрад Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна агульнай колькасцю 3113 чалавек у саставе 104 лінейных атрадаў. З іх — 58 будаўнічых, 46 — небудаўнічых і 2 абменных інтэратрады, якія працавалі ў ГДР і НРБ.

Геаграфія дыслакацыі — Карэлія і Беларусія, Малдавія і Якуція, Алтайскі край, Казахстан і Цюмень.

Будаўнічымі атрадамі асвоена каля 5 млн. руб. капіталаўкладанняў, выпрацоўка на аднаго байца СБА за працоўны семестр склала 3057 рублёў.

Якасць работ, выкананых СБА, у асноўным добрая і выдатная. Дваццаць аб'ектаў здадзены са «Студэнцкім знакам якасці». Дваццаць восем атрадаў працавалі па метаду брыгаднага падраду. Байцамі СБА было пададзена 30 рацпрапаноў з агульным эканамічным эфектам каля 63 тысяч рублёў.

Праводзілася вялікая грамадска-палітычная работа. Прачытана 1436 лекцый, дадзена 712 канцэртаў, адрамантавана 110 школ, арганізавана 120 кансультацыйных пунктаў, перададзена школьным і вясковым бібліятэкам 3894 экзэмпляры кніг, абсталявана 95 спецкабінетаў і фоталабараторый, арганізавана 43 лагеры-спадарожнікі, у якіх адпачыла 1488 дзяцей.

Атрадамі універсітэта праведзена значная работа па аперацыях «Памяць», «Летапіс Вялікай Айчыннай». Адрамантавана і добраўпарадкавана 88 помнікаў загінуўшым воінам, аказана дапамога 270 ветэранам вайны і працы, запісана 163 успаміны ветэранаў вайны.

Усе студэнцкія атрады залічылі ў свой састаў Ганаровымі байцамі герояў вайны і працы. За Ганаровых байцоў у дні ўдарнай працы было пералічана звыш 102 тысяч рублёў.

Удзельнічаючы ў рэалізацыі Харчовай праграмы, байцы зводнага СБА універсітэта адпрацавалі на суботніках 5104 чалавека-дні. Было нарыхтавана 2161 тона сена, 676 тон сенажу, перапрацавана 2350 тон збожжа, апрацавана звыш 360 гектараў зямлі, сабрана 1573 тоны гародніны.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва лепшымі прызнаны: юрыдычны факультэт, факультэт радыёфізікі і электронікі, механіка-матэматычны факультэт.

● ФОТАРЭПАРТАЖ З ЛЕТА ●

## МЫ ПАМЯТАЕМ ЦЯБЕ, УСЦЬ-ІЛІМСК!



(Працяг. Пачатак на 2-й стар.).

На здымку — камісар нашага атрада Алена Ліпа рапартуе камандзіру занальнага штаба аб грамадска-палітычнай дзейнасці.

Як было прыемна пачуць, што па выніках першага месяца мы займаем першае месца.

Лена Парфенава — адна з самых паважаных байцоў атрада. А як жа інакш, калі яна была і мастаком, і поварам.

(Заканчэнне на 4-й стар.).



## АБ'ЯЎЛЯЕЦЦА ПАДЗЯКА

**УПРАЎЛЕННЕ Рэспубліканскага піянерскага лагера ЦК ЛКСМБ «Зубраня» выказвае падзяку байцам камуністычнага студэнцкага атрада «Юнацтва» БДУ імя У. І. Леніна за выдатную работу ў якасці піянерскіх важатых.**

## НЯМА НІЧОГА ДАРАЖЭЙ

ДАЎНЯЯ ДРУЖБА звязвае СССР і НРБ, ВЛКСМ і Дзімітраўскі камуністычны саюз моладзі. Адной з форм супрацоўніцтва братэрскіх саюзаў з'яўляецца абмен студэнцкімі будаўнічымі атрадамі. Белдзяржуніверсітэт абменьваецца будатрадамі з Ямбольскім педагагічным інстытутам імя Д. Благоева. Ужо стала традыцыяй, што атрад, які выязджае ў НРБ, носіць імя Лілі Карастаянавай — мужнай дачкі балгарскага народа, што змагалася і загінула ў суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны на беларускай зямлі.

Атрад працаваў на будаўніцтве аб'ектаў народнай гаспадаркі ў горадзе Ямболе разам з балгарскімі будаўнічымі брыгадамі. Мы лічым, што нам пашанцавала, таму што мы бачылі Балгарыю не з акна экскурсійнага аўтобуса. Мы бачылі Балгарыю працоўную, будзённую. Нас было ўсяго дваццаць — байцоў СБА, і працавалі мы крыху больш за два тыдні, але гэтага часу было дастаткова, каб пасябраваць з тымі, хто працаваў з намі плячо ў плячо. І не выпадкова, што дырэктар арганізацыі, якая прымала наш атрад, таварыш Косеў, так ацаніў нашу дзейнасць: «Вы паказалі прыклад добрасумленных адносін да працы».

А потым былі экскурсіі, арганізаваныя нашымі балгарскімі сябрамі. Варна, Сонечны Бераг, старажытная Сафія... Ужо тады мы ведалі, што гэта запомніцца назаўсёды.

...На двары лістапад, ідуць заняткі, усё далей адыходзіць будатрадаўскае лета. Але ўсё часцей у стосе пісьмаў, якія прыходзяць у інтэрнат, бачыш лісты з сонечнай Балгарыі і разумееш: няма нічога даражэй за дружбу.

**В. ШАДУРСКІ,**
**камісар атрада.**

## «ТЫ АДКРЫВАЕШ ЦЭЛЫ СВЕТ»

СТУДЭНЦКАЕ ПРАЦОЎНАЕ ЛЕТА... У сэрцы кожнага, хто хоць аднойчы апранаў будатрадаўскую форму, яно застаецца назаўсёды, таму што кожны дзень цябе чакае адкрыццё. Ты адкрываеш у сябе новыя магчымасці, адкрываеш у сваім сябры новыя рысы, адкрываеш сваю краіну, ты адкрываеш для сябе цэлы свет. І гэта на працягу некалькіх месяцаў! Нездарма студэнцкія будаўнічыя атрады называюць школай жыцця.

Свой працоўны семестр студэнцкі будаўнічы атрад «Мінск-83» праводзіў у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. Мы прымалі ўдзел у працоўнай аперацыі нямецкай моладзі «Здаровы лес».

Двойчы на працягу апошніх пяці гадоў над Цюрынгіей, якую называюць «зялёным сэрцам ГДР», праносіліся жорсткія ўраганы. У гаротным становішчы аказаліся лясы — галоўнае багацце Цюрынгіі. На дапамогу лясной гаспадарцы рэспублікі прыйшла моладзь. Вялікую дапамогу ў гэтай патрыятычнай справе аказваюць і братэрскія саюзы моладзі.

Інтэрнацыянальны лагер Йенскага універсітэта сабраў разам студэнтаў з СССР, НРБ, ЧССР і ГДР. Акрамя СБА «Мінск-83», у лагеры працавала яшчэ тры атрады з Савецкага Саюза. Гэта былі прадстаўнікі Ленінградскага інстытута дакладнай механікі і оптыкі, Казахскага педагагічнага інстытута і Тбіліскага дзяржаўнага універсітэта. Балгарыю прадстаўляла студэнцкая брыгада універсітэта г. Вяліка Тырнава, Чэхаславакію—брыгада універсітэта г. Прэшава.

З першага дня работы паміж атрадамі разгарэлася сацыялістычнае спаборніцтва. Для яго арганізацыі і паспяховага правядзення былі ўсе ўмовы: атрады працавалі на расчыстцы леса, участкі размяшчаліся ў адным лясным масіве, дакладна былі ўстаноўлены нормы выпрацоўкі, штодзённа падводзіліся вынікі. Нам было прыемна даведацца, што мінулагоднія нашы атрады стварылі добрую думку пра БДУ імя У. І. Леніна, таму яшчэ да пачатку працы наш атрад расцэньвалі як галоўнага прэтэндэнта на перамогу ў сацыялістычным спаборніцтве. Цяпер, пасля заканчэння працоўнага семестра, можна сказаць: СБА «Мінск-83» прадоўжыў слаўныя традыцыі зводнага атрада універсітэта.

Гэта было пацверджана ўжо ў першы працоўны дзень — норму выканалі на 116 працэнтаў. Рэзультат аказаўся лепшым сярод атрадаў. Камандзір А. Шыбут, брыгадзіры Р. Грынкевіч і М. Нядбайла добра арганізавалі работы. Захапіўшы лідэрства, атрад не здаў сваіх пазіцый да апошняга дня. Нават цяжка вылучыць лепшых, усе працавалі сумленна, але ўсё ж хочацца адзначыць нашых дзяўчат М. Корзун, Л. Мішчонак, А. Капусціну і іншых. Дзякуючы іх намаганням, якасць расчысткі нашага ўчастка значна адрознівалася (у лепшы бок) ад іншых. За сваю працу атрад быў узнагароджаны сцягам акружнога камітэта Саюза свабоднай нямецкай моладзі і Ганаровай граматай міністэрства лясной гаспадаркі ГДР.

Прайшоў трэці працоўны. Нельга сказаць, што ў атрадзе ўсё было гладка. Узнікалі і ў нас складаныя, часам канфліктныя, сітуацыі, не абышлося без прыціркі характараў. І тым не менш, атрад заўсёды заставаўся дружным калектывам. Калектывам аднадумцаў і паплечнікаў.

**В. МАЛАФЕЕЎ,**
**камісар атрада.**

# Мы — «Мінчане»

**Лепшым СБА Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ў 1983 годзе стаў атрад «Мінчане» механіка-матэматычнага факультэта. «Мінчане» расказваюць пра сябе...**

«СБА «Мінчане» запрашае на гутарку. Месца дыслакацыі атрада — Алтайскі край. Камандзір — Валерый Гайко, камісар — Міхаіл Некрашэвіч».

З гэтай аб'явы ў студзені 1983 года пачалася гісторыя нашага атрада. Праўда, «пачалася» — гэта не зусім дакладна. Атрад з такой назвай быў даўно вядомы на механіка-матэматычным факультэце. Чырвоныя вымпелы і ганаровыя граматы расказваюць пра тое, як працавалі рабяты на Пскоўшчыне і ў Карэліі. У Якуціі камандзірам быў Валерый Гайко, у тыя часы начальнік штаба працоўных спраў ММФ. Але ішоў час, амаль усе байцы «Мінчан» скончылі універсітэт, і Валерыю Гайко давялося нанава ствараць калектыў.

Вельмі адказным для «Мінчан» быў падрыхтоўчы перыяд. Не сакрэт, што ў некаторых атрадах гэтая работа вядзецца не лепшым чынам, у асноўным, для справаздачы. Многія студэнты лічаць, што добрая падрыхтоўка — гэта не так ужо і важна, асноўнае вырашыцца там, дзе атрад будзе працаваць. Валерый лічыў інакш. На яго думку, многае вырашаецца іменна ў падрыхтоўчы перыяд. Добра падрыхтаваны, дружны атрад зможа з поспехам выйсці з самага цяжкага становішча. А тое, што на Алтаі нас чакае нямала цяжкасцей і нечаканасцей, — у гэтым ніхто не сумняваўся.

Строгая дысцыпліна і асабістая адказнасць кожнага за выкананне даручэння сталі абавязковымі для ўсіх кандыдатаў у байцы. Мерапрыемствы планаваліся і праводзіліся так, каб можна было з розных бакоў ацаніць кожнага. Як чалавек ставіцца да справы, як ён паводзіць сябе ў калектыве, як рэагуе на цяжкасці? Безумоўна, на ўсе гэтыя пытанні адкажа працоўны семестр, але ці не лепш усё ведаць раней? І вось СБА «Мінчане» ідзе ў тэатр, праводзіць вечар гумару ў кафэ «Гаўдэамус» разам з будатрадам «Стэлуца». Перад атрадам выступаюць агітбрыгада і лектарская група, а потым адбываецца сур'ёзны крытычны разбор іх работы. Адказны за спартыўную работу, член зборнай універсітэта па баскетболу В. Рычок, арганізуе наведванне басейна, футбольны матч «ветэранаў» і «навічкоў». Важную ролю ў канчатковым вызначэнні саставу атрада адыграла здача норм ГПА.

Усе гэтыя мерапрыемствы можна аднесці да нетрадыцыйных, не многія будатрады іх праводзяць. Але нам яны дапамаглі стаць сапраўдным калектывам яшчэ да пачатку працоўнага семестра. А гэта вельмі важна.

Атрад працаваў у ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга саўгасе «Рубцоўскі», які размясціўся на поўдні Алтайскага краю, у гарачых стэпах. Мясцовасць гэта лічыцца зонай рызыкоўнага земляробства, ураджаі даюцца няпроста, і людзі ведаюць цану працы. Іх цяжка здзівіць добрай работай, яшчэ больш цяжка заслужыць іх павагу. Зразумела, што працаваць мы імкнуліся сумленна, каб пацвердзіць славу нашай рэспублікі.

Кіраўніцтва саўгаса стварыла добрыя бытавыя ўмовы, але галоўным сведчаннем гасціннасці было тое, што нам даверылі будаўніцтва самых важных для гаспадаркі аб'ектаў: цагельнага завода, гаража для грузавых машын, машына-трактарных майстэрань, рамонт гароднінасховішча і жывёлагадоўчых памяшканняў.

200 тысяч рублёў асваення, завяршэнне работ на ўсіх аб'ектах сведчаць аб тым, што атрад працаваў выдатна.

У вёсцы ўсё жыццё праходзіць, як кажуць, на вачах. Не быў выключэннем і наш атрад. Таму вялікую ўвагу мы ўдзялялі знешняму выгляду байцоў, афармленню лагера. З мясцовымі жыхарамі «Мінчане» сябравалі, а пачаткам гэтага сяброўства стаў вечар адпачынку, на які мы запрасілі ўсіх жадаючых. Вялікая зала новага клуба была цалкам запоўнена, прыйшло больш за 500 чалавек. Вечар пачаўся з лекцыі аб горадзе Мінску, потым выступала агітбрыгада. Рабяты старанна рыхтаваліся да гэтага вечара і былі шчодра ўзнагароджаны: такой непасрэднай, эмацыянальнай, добразычлівай рэакцыі гледачоў маглі б пазайздросціць і прафесійныя артысты.

Многае было зроблена і для дзяцей працаўнікоў саўгаса: пабудавалі і аформілі дзіцячую пляцоўку, у мясцовую школу перадалі бібліятэчку, кнігі для якой байцы збіралі задоўга да паездкі. Двойчы ў тыдзень наш лагер трапляў у дзіцячую «асаду». Малыя чакалі «дзядзьку Валодзю». І Уладзімір Касцюкевіч, не паспеўшы нават павячэраць, бег да іх, і пачыналіся чарговыя заняткі гуртка па маляванню.

...Калі людзі робяць сапраўдную справу, ім абавязкова сустракаюцца цяжкасці. Былі яны і ў нас. Перабоі ў забеспячэнні матэрыяламі і механізмамі маглі б збіць атрад з рытму, але байцы працавалі самааддана і здолелі закончыць да ад'езду будаўніцтва зімовага гаража.

...На закрыццё лагера да нас прыйшлі кіраўнікі саўгаса. Было сказана нямала добрых слоў, і было прыемна, што «Мінчане» здолелі пакінуць аб сабе добрую памяць.

**А. МАНАСТЫРНЫ,**
**баец атрада.**

## *Журавлята*

Ввысь журавлят зовут ветра
могучие,
Влечёт их крылья испытать
свои.
Вчерашние птенцы парят над
тучами,
Впервые оторвавшись
от земли.
Пусть не всегда всё сразу
получается,
Но все ж построим наши
города,
Как журавлята, сил мы
набираемся,
Чтоб буря побороть нас
не смогла.
Вперёд зовут тайга и степь
бескрайние,
Пришла пора на деле доказать,
Что могут молодые
и крылатые,
Ну, а задора нам не занимать.
Горит костёр. Мечтается
и верится,
Слегка саднят мозоли
на руках...
Не скоро стройки эти
позабудутся,
Как вожакам — их первый
крыльев взмах.

**И. ПРИХОДЬКО,**
**боец ССО имени**
**А. Альвареса.**

# «Працавалі разам з сябрамі»

У ЛІПЕНІ-ЖНІЎНІ гэтага года байцы камуністычнага інтэрнацыянальнага СБА імя Г. Дзімітрава, сфарміраванага на базе гістарычнага факультэта, прымалі студэнцкі будаўнічы атрад Ямбольскага педагагічнага інстытута з НРБ. Атрады дыслацыраваліся ў гарадскім пасёлку Плешчаніцы Лагойскага раёна і выконвалі работы па рэканструкцыі птушкафабрыкі. За кароткі перыяд байцы інтэратрада асвоілі больш за 20 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Калі студэнты з Балгарыі прыехалі на месца дыслакацыі, байцы нашага атрада адразу ж прынялі іх у свой дружны калектыў. Члены лектарскай групы расказалі нашым сябрам аб гісторыі СССР, аб нашай цудоўнай Беларусі, аб традыцыях будатрадаўскага руху ў краіне. На ўрачыстай лінейцы, прысвечанай адкрыццю міжнароднага маладзёжнага лагера, байцоў віталі сакратар камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна А. Казулін, начальнік штаба працоўных спраў А. Астапенка, кіраўнікі прымаючай арганізацыі.

Балгарскім студэнтам уручылі беларускія сувеніры. А потым адбыўся вечар дружбы. Жарты і смех, конкурсы, у ходзе якіх высвятляліся веды па гісторыі Беларусі і гісторыі студэнцкага будаўнічага руху ў БССР і НРБ, — усё гэта спрыяла таму, што вечар прайшоў весела і цікава.

У першы дзень работы ў атрадзе было створана пяць інтэрнацыянальных брыгад. Тры з іх узначалілі нашы балгарскія сябры. Лепшымі за перыяд работы сталі байцы: Станча Станчаў, Іван Іваноў, Дзялян Бабокаў, Аляксандр Ягела, Святаслаў Кулік і іншыя.

На будоўлі цалкам выявіліся братэрскі інтэрнацыяналізм і ўзаемадапамога. Кожны баец, кожная брыгада, калі гэта было патрэбна, прыходзілі на дапамогу сябрам. На высокім узроўні вялася ў атрадзе і грамадска-палітычная работа. Была створана інтэрнацыянальная агітбрыгада, праводзіліся палітінфармацыі, гутаркі, конкурсы на тэму: «Як ты ведаеш Савецкі Саюз?», «Як ты ведаеш НРБ?». Не былі забыты і спартыўныя спаборніцтвы.

...Непрыкметна праляцеў час. Прыйшла пара развітання. Цяжка было развітвацца людзям, якія цэлы месяц жылі аднай дружнай сям'ёй. Былі і слёзы, і пажаданні, і надзеі сустрэцца зноў. Як было б добра, калі б спраўдзіліся гэтыя надзеі!

**І. КРЫШТАН,**
**камандзір атрада.**

**● ФОТАРЭПАРТАЖ З ЛЕТА ●**

# *Мы памятаем цябе, Усць-Ілімск!*





**(Заканчэнне. Пачатак на 2—3 стар.).**

... Бадай, гэта быў самы цікавы дзень за ўвесь час нашага жыцця ў Усць-Ілімску. Фестываль сабраў у адно месца ўсіх тых, хто з розных куткоў нашай Радзімы, з розных куткоў свету прыехаў сюды, каб унесці свой уклад у будаўніцтва маладога сібірскага горада. Канцэрты, конкурс дзіцячых малюнкаў, паказальныя выступленні кубінскіх бейсбалістаў — усё гэта вылілася ў вялікае свята моладзі.

Будатрад — гэта не толькі праца, але і вясёлы адпачынак. Здавалася, находзілі на хлопцаў сум, успаміны аб роднай Беларусі, аб каханай. Тады сядзелі яны сцішыўшыся ў якім-небудзь куточку. Вось і ў Валодзі Некрашэвіча, відаць, такі настрой. Праўда, сумавалі мы рэдка. Часцей гучалі вясёлыя, бадзёрыя будатрадаўскія песні.

**С. ПЛЫТКЕВІЧ,**
**баец СБА «Волаты».**



**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**

**10 лістапада 1983 г.**

Зак. 1884. АТ 04537

**220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.**

**ТЭЛЕФОН 20-68-27.**

**Рэдактар**
**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**